# “Гістарычная адукацыя дапамагае адчуваць адказнасць перад продкамі і нашчадкамі”



***Інтэрв'ю галоўнага рэдактара “Беларускага гістарычнага часопіса” Аляксандра КОРЗЮКА з дэканам факультэта гуманітарыстыкі і моўных камунікацый ВДУ імя П.М.Машэрава, доктарам педагагічных навук, прафесарам Сяргеем НІКАЛАЕНКАМ***

— Паважаны Сяргей Уладзіміравіч! Якую ролю, на Ваш погляд, адыгрывае гісторыя ў жыцці грамадзяніна? Якой Вы бачыце ролю сучаснай гістарычнай адукацыі?

— Сучасны свет такі імклівы, рухавы, што мы часам не задумваемся над тым, што нас чакае наперадзе. А наперадзе — светлая будучыня, аб якой, я ўпэўнены, усе мараць. Наперадзе — чалавек і яго свет у гармоніі з Сусветам і самім сабою.

Мяне яшчэ ў школе вучылі: без мінулага няма ні сучаснасці, ні будучыні. І мне здаецца, менавіта гістарычная адукацыя дапамагае і школьніку, які толькі-толькі пачынае спасцігаць свет, і студэнтам, якія засвойваюць азы прафесіі, і тым, хто ўжо працуе, будаваць гэтую светлую будучыню, адчуваць адказнасць за яе перад продкамі і нашчадкамі. Таму авалоданне гістарычнымі ведамі, без якіх немагчыма выхаваць патрыёта, тое, што мы закладваем у школе і ва ўніверсітэце, думаю, будзе адным з важнейшых паказчыкаў жыцця сучаснага чалавека.

Веданне дат, падзей, з'яў, на мой погляд, гэта яшчэ не веданне гісторыі. Сапраўднае веданне пачынаецца менавіта з разумення прычынна-выніковых сувязяў, тэндэнцый гістарычнага працэсу. Але каб гэта прыйшло, вельмі важна зацікавіць навучэнцаў. Таму мне хацелася б, каб гістарычная адукацыя распавядала гісторыю. На маю думку, праз такую камунікацыйную, жанравую форму, як гістарычнае апавяданне, гістарычная замалёўка, а таксама праз выкарыстанне элементаў тэатралізацыі, гістарычнай рэканструкцыі настаўнік можа зацікавіць вучняў. Менавіта так можна ўплываць на пачуццёвую сферу, а значыць, стварыць умовы для эфектыўнага выхавання грамадзяніна і патрыёта сваёй краіны.

— Раскажыце, што ўяўляе сабой факультэт гуманітарыстыкі і моўных камунікацый. У чым Вы бачыце яго перавагу перад іншымі факультэтамі, якія рыхтуюць спецыялістаў-гісторыкаў?

— У ВДУ імя П.М.Машэрава было два факультэты з даўнімі традыцыямі — філалагічны і гістарычны, цяпер мы аб'ядналіся. Мне вельмі падабаюцца сучасныя інтэграцыйныя працэсы, якія адбываюцца і на ўзроўні краін, і на ўзроўні вучэбных дысцыплін. Інтэграцыя гісторыі і філалогіі адбылася і ў нас, дзякуючы чаму з'явіўся якасна новы факультэт.

Перавагу нашага факультэта я бачу менавіта ў той міждысцыплінарнасці, якая закладзена ў гуманітарных навуках. Безумоўна, мы і філалогію, і гісторыю можам аб'ядноўваць і з прыродазнаўчымі навукамі, і з творчымі дысцыплінамі, але, мне здаецца, інтэграцыя філалогіі (лінгвістыка, літаратуразнаўства) і гісторыі — гэта наш “канёк”, які дапамагае студэнтам узаемна ўзбагачацца.

Напрыклад, гісторыкі абавязкова вывучаюць курсы сусветнай і айчыннай літаратуры. Гэта не толькі дае ім дадатковыя веды пра пісьмовыя гістарычныя крыніцы, а галоўнае — тыя фонавыя веды, якіх так не хапае сучасным школьнікам і студэнтам. У той жа час аналіз развіцця мовы і літаратуры немагчымы









без гістарычнага кантэксту. Таму гістарычныя веды філолагу, безумоўна, патрэбныя, нават для адэкватнага аналізу класічных літаратурных твораў. І мы ствараем умовы для набыцця такіх ведаў.

— Якімі Вы бачыце галоўныя задачы пры падрыхтоўцы маладых спецыялістаў гуманітарнага профілю?

— Гэтыя задачы, на мой погляд, заключаюцца ў валоданні тымі кампетэнцыямі, якія сфармуляваны ў вучэбных планах. Што тут важна дадаць? Важна вырашыць галоўныя задачы. Першае — каб студэнт хацеў быць адукаваным спецыялістам, які любіць тое, што ён вывучае, ведаў, як ён можа скарыстаць гэтыя веды на практыцы і як ён потым можа самастойна здабываць веды з розных крыніц. Вось калі ён самастойна вырашыць кола гэтых задач, мяркую, ён будзе вельмі добрым спецыялістам. А наша галоўная мэта — такога спецыяліста падрыхтаваць.

Другі комплекс задач звязаны з фарміраваннем грамадзянскай пазіцыі. Гістарычная і філалагічная адукацыя вельмі дапамагаюць гэта зрабіць. Мне прыгадваюцца словы рускага паэта XIX ст. Мікалая Аляксеевіча Някрасава, які казаў: *"Поэтом можешь ты не быть, но гражданином быть обязан"*. У беларускай літаратуры адным з такіх паказчыкаў для мяне з'яўляюцца словы майго любімага класіка Якуба Коласа: *"О край мой мілы!.. Усёй душой хачу злучыцца я з табою..."*

І трэцяя група задач — навуковы напрамак. Асабліва ў гістарычнай адукацыі, асабліва пры рабоце з тэкстамі. Хоць хтосьці можа і сказаць, што філолагі ўсё ўжо даўно прачыталі ў гістарычных тэкстах, а гісторыкі — у літаратурных. Шмат чаго яшчэ не прачыталі! Новыя знаходкі заўжды адбываюцца. Здаецца, зацікавіць школьніка ці студэнта пайсці ў архіў, знайсці штосьці і выдаць свету новае, навуковае, пацверджанае фактамі, крыніцамі гістарычнымі, літаратурнымі крыніцамі, — гэта вельмі цікавая камунікацыя паміж гісторыяй і філалогіяй.

— Вядома, што на факультэце функцыянуюць шматлікія лінгвістычныя цэнтры. Раскажыце пра іх дзейнасць і ролю ў падрыхтоўцы гісторыкаў.

— Я пералічу цэнтры, якія функцыянуюць у нас на факультэце: гэта Цэнтр славянскіх моў і культур, Цэнтр французскай мовы і культуры імя Рэнэ Дэкарта, Цэнтр кітайскай мовы і культуры, а таксама Навукова-асветніцкі цэнтр "Спадчына Віцебскай зямлі". У апошняга Цэнтра шэсць напрамкаў дзейнасці, і два з іх звязаныя з лінгвістыкай, у прыватнасці з анамастычнай прасторай Віцебскай зямлі, з моўным абшарам расійска-беларускага памежжа.

Яшчэ адзін напрамак — літаратурная Віцебшчына, якая дала вядомых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў: Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Уладзіміра Караткевіча, Петруся Броўку. У межах Цэнтра даследуецца жыццё і дзейнасць іншых культурных дзеячаў, якія нарадзіліся ці жылі на Віцебшчыне. Каму, як не гісторыкам, у гэтых напрамках працаваць? Цэнтры ствараюць міждысцыплінарную прастору, пра якую мы ўжо казалі. Напрыклад, студэнты-гісторыкі займаюцца анамастычнымі праблемамі, пры аналізе крыніц скарыстоўваюць веды ў галіне тапанімікі і антрапанімікі.

Зараз у цэнтры "Спадчына Віцебскай зямлі" рэалізуецца праект філолагаў і гісторыкаў па "віцеб-

скай квадрызе" — Шагал, Малевіч, Бахцін і Салерцінскі, архіўную частку якога забяспечваюць менавіта нашы студэнты-гісторыкі. Больш за тое, яны далучаюць да гэтай дзейнасці вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі Віцебска. Вучні 7 і 8 класаў разам са студэнтамі ідуць у архіў і там вучацца працаваць з дакументамі. Мы акцэнтуем увагу на педагагічную дзейнасць кожнага з прадстаўнікоў "квадрыгі", якой яны займаліся ў часе жыцця ў Віцебску. Такім чынам, гэтая работа дазваляе выпрацоўваць і ўдасканальваць прафесійныя кампетэнцыі будучых настаўнікаў гісторыі.

Студэнты гістарычных спецыяльнасцяў прымаюць актыўны ўдзел у дзейнасці Цэнтра кітайскай мовы і культуры, дапамагаюць у правядзенні факультатыўных курсаў па гісторыі і культуры Кітая. Гісторыкі адгукаюцца на ўсе нашыя мерапрыемствы, якія ладзяцца ў рамках Цэнтра славянскіх моў і культур, напрыклад фестываль беларускага слова, у акцыях да Дня Канстытуцыі нашай краіны "Праз дыялог моў — да душы, да сэрца". Зараз на факультэце мы арганізоўваем мерапрыемствы, звязаныя з 1050-годдзем з дня заснавання Віцебска. Гісторыкі і студэнты спецыяльнасці "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны" працуюць з фондамі народнага літаратурнага музея, які створаны пры факультэце.



*Студэнты факультэта пад час семінарскіх заняткаў.*




*Студэнты факультэта пад час экскурсіі каля будынку Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.*

— Якасць навучальных праграм… Ці своечасова іх абнаўляюць? Ці ўкараняюцца на факультэце найноўшыя тэхналогіі навучання? Раскажыце, якія захады Вы势 плануеце зрабіць для вырашэння гэтых задач.

— Выкладчыкі гістарычных дысцыплін пільна сочаць за найноўшымі дасягненнямі гістарычнай і метадычнай навук, прымаюць актыўны ўдзел у абмеркаванні вучэбна-праграмнай дакументацыі, падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў у галіне гістарычнай адукацыі.

Загадчык кафедры гісторыі і культурнай спадчыны Анатоль Мікалаевіч Дулаў з'яўляецца чальцом шматлікіх саветаў і камісій, у прыватнасці Каардынацыйнага савета пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь па развіцці гістарычнай навукі і адукацыі, камісіі па вывучэнні і выпрацоўцы канцэптуальных падыходаў айчыннай гісторыі Рэспубліканскага савета

па гістарычнай палітыцы, рэспубліканскага Навукова-метадычнага савета па гістарычных навуках і тэалогіі. Таму ён, як кажуць, трымае руку на пульсе і ўносіць прапановы па павышэнні эфектыўнасці падрыхтоўкі настаўнікаў гісторыі, наданні ёй практыка-арыентаванага характару.

Безумоўна, гістарычная адукацыя патрабуе не проста ведання гістарычных фактаў, але і наяўнасці навыкаў іх аб'ектыўнай і навукова карэктнай інтэрпрэтацыі, валодання гутаркай, дыялогам, нават дыскусіяй. І да гэтага мы студэнтаў таксама рыхтуем. Сярод новых адукацыйных тэхналогій за апошнія гады мы ўключылі ў навучальны працэс правядзенне імерсіўных экскурсій. Нашы студэнты самі іх распрацоўваюць, здымаюць відэа, перакладаюць тэксты на розныя мовы. Мы прэзентуем гэтыя экскурсіі, хочам, каб яны былі карысныя і для турызму, і для адукацыйнай сферы. Імерсіўную экскурсію мы паказалі пад час першага "Дня Бахціна ў Віцебску", зараз ствараем іх па асобах Шагала, Малевіча і Салерцінскага.



*Студэнты і выкладчыкі факультэта ў Мемарыяльным комплексе "Прарыў".*

Яшчэ адзін здабытак, якім мы можам падзяліцца са светам, — гэта настольныя гульні. Наша студэнтка другога курса спецыяльнасці "Гістарычная адукацыя" Валерыя Мядзведзева — пераможца Рэспубліканскага конкурсу "100 ідэй для Беларусі" з такой гульнёй па творах Нікіфароўскага. Больш за тое, мы ёй падказалі, каб яна для гэтай гульні зрабіла імерсіўнасць, каб гульцы адчулі атмасферу губернскага Віцебска на мяжы XIX—XX стст. Вы можаце паглядзець гэтую гульню з цудоўным трэйлерам у сацыяльных сетках (https://vk.com/club223814615).

*Студэнты гістарычнага факультэта на раскопках у Полацку. 2008 г.*



Усю нашу метадычную працу па выхаванні і фарміраванні сучасных якасцяў грамадзяніна Рэспублікі Беларусь мы аб'ядноўваем у пэўныя "хэштэгі". Напрыклад, у гэтым годзе на факультэце ва ўсёй вучэбнай і выхаваўчай працы на занятках і па-за імі "чырвонай ніткаю" праходзяць тэмы 1050-годдзя Віцебска, 80-годдзя з дня вызвалення Беларусі, 100-годдзя з дня нараджэння нашага земляка, народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава, 50-годдзя стварэння філалагічнага факультэта. То бок міждысцыплінарнасць, з якой я пачынаў і хачу гэтым завяршыць, пашыраем, паглыбляем, каб нашы выпускнікі былі на самай справе грамадзянамі і патрыётамі сваёй Айчыны.

***— Дзякуй, Сяргей Уладзіміравіч, за адказы. Жадаем Вам і прафесарскага-выкладчыцкаму саставу факультэта здзяйснення ўсіх планаў, карпатлівай і плённай працы на карысць гістарычнай навукі роднай Беларусі!***